**СЛОНІМСКІ РАЁН**

# СЛОВА АДГУКНУЛАСЯ Ў СЭРЦАХ

**2 снежня члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, слонімскія паэтэсы Ірына Войтка і Надзея Салейка прынялі ўдзел у творчай вечарыне пад назвай «Стихи как музыка души».**

Мерапрыемства арганізавала бібліятэкар Інтэграванай бібліятэкі аграгарадка Навасёлкі Слонімскага раёна Ірына Генадзьеўна Ліхачова. На сустрэчу з паэзіяй і песняй ў суботні вечар прыйшлі зацікаўленыя вяскоўцы, чытачы бібліятэкі. На пачатку сустрэчы Ірына Генадзьеўна пазнаёміла з падрыхтаванай тэматычнай выставай «Слонімшчына літаратурная», распавяла пра навінкі мастацкай літаратуры, што апошнім часам з’явіліся ў бібліятэцы.

Кіраўнік Слонімскага раённага літаратурнага аб’яднання імя Анатоля Іверса, паэтэса Ірына Войтка пагутарыла з прысутнымі аб ролі літаратуры ў грамадстве, прачытала свае вершы на тэму паэта і паэзіі, аб Радзіме, родным слове, аб Слоніме, аб роднасці і бацьках, а таксама творы з пейзажнай лірыкі.

Паэтэса і мастачка, народны майстар Надзея Салейка распавядала пра свой жыццёвы і творчы шлях, таксама чытала свае вершы на духоўную і патрыятычную тэматыку. Асабліва ўразілі слухачоў песні і рамансы ў выкананні самой аўтаркі. Усе ўдзельнікі сустрэчы атрымалі зарад станоўчых эмоцый. Такія мерапрыемствы нікога не пакідаюць абыякавым. Вось і ў Навасёлках роднае паэтычнае слова цеплынёй адгукнулася ў сэрцах людзей.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Навасёлкі Слонімскага раёна стала месцам правядзення творчай вечарыны пад назвай «Стихи как  музыка души». У праграме мерапрыемства выступілі члены СПБ, слонімскія паэтэсы Ірына Войтка і Надзея Салейка. 2 снежня 2023 года. Гродзенская вобласць.




**Ірына Генадзьеўна Ліхачова і падрыхтаваная ёй тэматычная выстава «Слонімшчына літаратурная»**




**Ля мікрафона кіраўнік Слонімскага раённага літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Ірына Войтка**




**Дзякуючы выступленню паэтэсы, аўтара і выканаўцы песень Надзеі Салейкі мерапрыемства набыло літаратурна-музычны фармат**

